Created in Master PDF Editor - Demo Version

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 3(69) 2011

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

## Змест

***Галоўны рэдактар***
**П.Д. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
В.В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л.М. Давыдзенка
А.В. Данільчанка
А.П. Жытко
М.М. Забаўскі
І.В. Катляроў
П.В. Кікель
Г.А. Космач
А.М. Люты
У.А. Мельнік
А.І. Смолік
А.С. Цернавы
В.С. Цітоў
В.В. Шынкароў

### Паліталогія

*Зенчанка В.А., Сіманоўскі С.І.* Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі ....3

*Сіманоўскі І.С., Сіманоўскі С.І.* Станаўленне палітычнага прагназавання як навуковага кірунку ....8

*Ястраб Д.С., Шынкароў І.А.* Прававыя аспекты нацыянальнай бяспекі ....11

*Зенчанка С.В.* Знешняя міграцыйная палітыка Рэспублікі Беларусь: этапы станаўлення ....15

*Зенчанка В.А., Сарокін А.А.* Масавы таталітарны палітычны рух: сутнасць, асаблівасці, тэндэнцыі развіцця ....20

### Сацыялогія

*Кабяк А.В.* Сацыяльныя інтарэсы жыхароў Беларусі ў сацыялагічным вымярэнні ....25

*Галіч Л.П.* Сацыяльнае самаадчуванне насельніцтва Беларусі: аналіз рэгіянальных асаблівасцей ....29

*Хамутоўская С.В.* Электаральныя паводзіны насельніцтва: аналіз у рамках сацыяльна-псіхалагічнага падыходу ....34

*Шухатовіч В.Р.* Тытунекурэнне як сацыяльная з'ява ....39

*Шушунова Т.М.* Вывучэнне біялагічнай арыентацыі самазахаваўчых паводзін студэнцкай моладзі з выкарыстаннем метаду няскончаных сказаў ....43

*Андрас І. А.* Феномен прадпрымальнасці ў ацэнках беларускіх жанчын: шматмерны сацыялагічны аналіз ....48

*Раманава С.П.* Асноўныя падыходы да даследавання інстытута адукацыі ў сучаснай амерыканскай і брытанскай сацыялогіі ....53

### Эканоміка

*Давыдзенка Л.М., Давыдзенка Т.Д.* Міжнародныя стандарты інфармацыйных сістэм кіравання прадпрыемствам ....58

*Такарчук І.В.* Інавацыйны тып эканамічнага росту як ключавы фактар павышэння ўзроўню жыцця ў доўгатэрміновай перспектыве ....63

*Васьковіч В.В.* Прыродныя рэсурсы як грамадскі набытак і метады іх вымярэння ....67

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



УДК 321.64

**В.А. Зенчанка,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі і права БДПУ;*
**А.А. Сарокін,**
*студэнт V курса гістарычнага факультэта БДПУ*

# МАСАВЫ ТАТАЛІТАРНЫ ПАЛІТЫЧНЫ РУХ: СУТНАСЦЬ, АСАБЛІВАСЦІ, ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена тым, што ў сучаснай сацыяльнай і палітычнай псіхалогіі акцэнт у даследаванні палітычных працэсаў змяняецца з даследавання індывідуальнага палітычнага быцця на раскрыццё сутнасці і характарыстык масавых палітычных паводзін. Без даследавання палітычных паводзін мас, самай яскравай праявай якіх з'яўляецца масавы палітычны рух, немагчыма зразумець унікальнасць і дынаміку палітычнага працэсу ў XX ст.

*Мэта артыкула* заключаецца ў сістэмным даследаванні феномена масавага таталітарнага палітычнага руху, абгрунтаванні яго сутнасці, асаблівасцей і тэндэнцый развіцця. Пытанне аб масавым палітычным руху з'яўляецца амаль нераспрацаваным у сучаснай беларускай паліталогіі. Аб сутнасці і асаблівасцях таталітарнага палітычнага руху пісалі такія аўтары, як В. Райх, Х. Арэнт, М. Бросцат, В. Мазер, Н. Фрай, В. Адайнік і інш.

Пад масавым палітычным рухам разумеецца з'яўленне і функцыянаванне такіх палітычных сіл, якія спрабуюць змяніць існуючыя ўмовы жыцця ў грамадстве або замацаваць іх, уплываючы на палітычныя інстытуты шляхам выкарыстання шырокіх мас насельніцтва ў барацьбе за ўладу.

Рух – гэта заўсёды нейкае сумеснае імкненне людзей да рэалізацыі агульнай мэты. Асновай для з'яўлення такога відавочнага масавага імкнення з'яўляецца наяўнасць незадаволеных патрэбнасцей, якія вызначаюць масавы палітычны настрой. Назапашваючыся і развіваючыся, такія настроі аб'ядноўваюць людзей і вядуць іх да пэўных дзеянняў.

У гэтай сувязі Э. Канэці падкрэслівае: «Масе патрэбен напрамак. Яна знаходзіцца ў руху і рухаецца да чагосьці. Агульнасць напрамку для ўсіх, хто да яе належыць, узмацняе пачуццё роўнасці. Мэта, якая ляжыць паасобку і якая адносіцца да ўсіх, выцясняе прыватныя, няроўныя мэты, якія былі б для масы смяротнымі. Для таго, каб яна існавала, ёй неабходны напрамак» [1, с. 34].

У масавых палітычных рухах выразна прадстаўлены глыбінныя архетыпы палітычнай культуры грамадства, стэрэатыпы масавай свядомасці і формы палітычных паводзін. Пры гэтым рух здольны як працягваць традыцыйныя формы, стаць носьбітам кансерватыўных тэндэнцый у палітыцы, так і быць надзвычай рэвалюцыйным або рэакцыйным. У гэтай сувязі неабходна падкрэсліць, што палітычны рух дае задавальненне самаму шырокаму спектру ірацыянальных запатрабаванняў масавага чалавека.

Характарызуючы ўплыў масавага палітычнага руху на палітычны працэс, Д.В. Альшанскі адзначае: «Роля мас у палітыцы звычайна становіцца прыкметнай, калі з'яўляецца страшнай. Яна выяўляецца тады, калі разбураюцца групавыя сувязі, калі грамадства дэструктурыруецца, адчувае перыяд своеасаблівага "сацыятрасення". Такое адбываецца ў перыяды буйных, сусветных войнаў, сацыяльных рэвалюцый, палітычных пераваротаў, буйнамаштабных сацыяльных рэформаў» [2, с. 359].

Масавы палітычны рух як суб'ект палітыкі можа быць вызначаны ў якасці палітызаванага аб'яднання вялікай колькасці асоб з вельмі рознымі інтарэсамі. Удзельнікі руху дэманструюць сумесныя палітычныя дзеянні ў форме палітычных акцый: маніфестацый, дэманстрацый, мітынгаў. У стыхійных масавых пратэстных выступленнях, у адрозненне ад палітычных партый, адсутнічае адзіная праграма, статут і план дзеянняў, а ўнікальнай асаблівасцю таталітарных масавых рухаў з'яўляецца наяўнасць моцнага арганізацыйнага цэнтра, жорсткай іерархічнай структуры і плана дзеянняў па захопе ўлады.

Для правадыроў таталітарнага палітычнага руху галоўнай праблемай з'яўляецца дагматызацыя іх ідэалогіі, што значна паніжае ўзровень мабільнасці і радыкальнасці масавай палітычнай культуры. Так, нягледзячы на тое, што ў 1926 г. Гітлер абвясціў «25 пунктаў» нязменнымі, ён імкнуўся пазбегнуць дагматызацыі пастулатаў нацыянал-сацыялізму, бо гэта б прывяло да спаду дынамікі нацысцкага руху.

К. Гейдэн, знакаміты навуковец і аўтар аднаго з першых даследаванняў НСДАП, падкрэслівае: «Пры бурным развіцці руху нармаль-

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



ная адпаведнасць паміж формай і зместам немагчыма. Закончанасць, нязменнасць формы супярэчыла б характару партыі, якая свядома ішла на тое, каб прыстасавацца да становішча і ў выпадку няўдачы сагнуцца перад моцным» [3, с. 10].

Сістэмнасць сусветнага крызісу 20–30-х гг. XX ст. і ўзнікненне масавых палітычных рухаў былі абумоўленая трыма фундаментальнымі супярэчнасцямі: паміж плюралістычным характарам грамадзянскага грамадства і аўтарытарнай сутнасцю дзяржавы; паміж працай і капіталам; паміж імкненнем індывіда мець волю выбару і адначасова з гэтым мець выразную звышасабовую мэту.

Масавыя палітычныя рухі (асабліва гэта датычыцца таталітарных рухаў) заснаваны на феномене дэперсаналізацыі, калі чалавек губляе сувязь з самім сабой. Чалавек-маса як падмурак масавага палітычнага руху – гэта вынік адчужэння чалавека ад уласнага быцця, гэта рэакцыя на перавагу нігілізму ў сучасным свеце, на бессэнсоўнасць чалавечага існавання. Характарызуючы псіхалагічны партрэт удзельніка масавага палітычнага руху, Хасэ Артэга-і-Гасэт адзначае: «Пара ўжо азначыць першымі дзвюма рыскамі псіхалагічны малюнак сённяшняга масавага чалавека: гэтыя дзве рысы – бесперашкодны рост жыццёвых запытаў і, такім чынам, нястрымная экспансія ўласнай натуры і – другое – прыроджаная няўдзячнасць да ўсяго, што змагло палегчыць яму жыццё» [4, с. 57].

Атаясамліваючы сябе з фюрэрам, магутнай дзяржавай, адзінай партыяй і нацыяй, «маленькі чалавек» набывае доўгачаканую псіхалагічную аснову, стабільнасць, бяспеку. Што ж датычыцца яго бунтарскай натуры, то яна атрымлівае задавальненне ў поўнай меры, калі масавы рух знаходзіцца ў працэсе захопу ўлады. Характарызуючы ментальнасць чалавека-шрубкі таталітарнага нацысцкага руху, В. Райх піша: «Фашысцкая ментальнасць – гэта ментальнасць "маленькага чалавека", заняволенага, які імкнецца да ўлады і ў той жа час пратэстуе» [5, с. 15].

Унікальнай асаблівасцю палітычных паводзін чалавека ў масавым грамадстве з'яўляецца тое, што палітычныя паводзіны спачатку становяцца ўсеабдымнымі: сфера палітыкі паглынае ўсё чалавечае быццё, што рэалізуецца ў форме масавага палітычнага руху і ўсталявання таталітарнага рэжыму, а затым надыходзіць усеагульная дэпалітызацыя чалавека. Палітыка ў такіх умовах ператвараецца з мастацтва кіраваць людзьмі ў тэхналогію маніпуляцыі свядомасцю мас, у набор метадаў і тэхналагічных рашэнняў па падмане электарату, стварэнне кішэнных лідараў, штучных ідэй і ідэалогій.

Заклік да масавай ментальнасці адкрывае таталітарным партыям шлях да ўлады. Менавіта фанатычная падтрымка з'яўляецца галоўнай апорай масавага таталітарнага палітычнага руху. Маса, якая ідзе пад кіраўніцтвам харызматычнага лідара на бой з ворагамі, упэўнена, што любая перамога лідара – яе перамога, а ўлада лідара – яе ўлада.

Такім чынам, можна меркаваць, што таталітарныя рухі грунтуюцца на дзвюх узаемазалежных падставах:

- масавая эмацыянальная ўпэўненасць у магчымасці хуткага паляпшэння жыцця з дапамогай татальнага дзяржаўнага планавання і рацыянальных пераўтварэнняў;
- масавая псіхалагічная незадаволенасць адчужэннем асобы ў індустрыяльным грамадстве, яе неабароненасцю і адзінотай ва ўмовах дзікага капіталізму.

У характары таталітарнага рэжыму фактар масавага палітычнага руху займае цэнтральнае месца. *Па-першае,* менавіта праз грамадска-палітычны рух як сацыяльную базу рэжыму адбываецца фарміраванне ў грамадскай свядомасці «таталітарнай ідэі». *Па-другое,* праз грамадска-палітычны рух дасягаецца ўсеахопны кантроль над усімі праявамі грамадскага жыцця, што і забяспечвае ажыццяўленне татальнага панавання ўлады.

Вядомы нямецкі гісторык Г. Масэ характарызуе таталітарнае грамадства так: «Гэта грамадства не дапускала адрозненняў паміж палітыкай і паўсядзённым жыццём большасці. Гітлер збіраўся стварыць такое арганічнае грамадства, у якім усе бакі жыцця павінны былі ўзгадняцца з яго асноўнымі мэтамі. І нікому не дазвалялася стаяць убаку ад мэт, абвешчаных нацыянал-сацыялістычнай партыяй. Палітыка ў нацыянал-сацыялістаў была не адным з бакоў жыцця і не адной з навук сярод шматлікіх іншых, а дакладным выразам іх светапогляду. Ад кожнага немца патрабавалася строгая прыхільнасць да гэтых поглядаў, якая ахоплівала ўсе бакі чалавечага жыцця ў праявах расы, крыві і духоўнасці» [6, с. 6].

Прыкметы таталітарнага грамадска-палітычнага руху наступныя:

- мэта руху – усталяванне таталітарнай дыктатуры;
- зварот да сілы ў якасці галоўнай прылады для дасягнення мэты, а адгэтуль – тэрарыстычныя патэнцыяльныя Рухі;
- непрыманне апазіцыйных меркаванняў, непрымірымасць да іншых партый;
- ідэя свайго месіянскага прызначэння.

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



Нацызм у сучаснай гістарычнай і палітычнай навуках як сацыяльна-палітычны і маральна-псіхалагічны феномен не можа быць аб'ектыўна разгледжаны па-за катэгорыямі масавага палітычнага руху і масавай палітычнай культуры, якія вызначаюць палітычныя паводзіны мас. Сёння відавочна, што поспех НСДАП як партыі і нацызму, як масавага палітычнага руху (дэмагогія, тэрор і «подкуп поспехам») звязаны з палітычнымі паводзінамі народных мас, вышэйшай праявай якога стала масавая палітычная незадаволенасць Веймарскай рэспублікай. Мабілізуючы масы пры дапамозе майстэрства дэмагогіі, выкарыстоўваючы тэрор супраць іншадумцаў, ствараючы ў масавай свядомасці выяву ворага, і, нарэшце, падкупляючы поспехамі рэжыму (уяўнымі або рэальнымі), Гітлер абапіраўся на шырокі сацыяльны састаў свайго руху, па меры магчымасцей задавальняючы яго патрабаванні.

Нацыянал-сацыялістычны рух – гэта псіхалагічная праблема, але самі псіхалагічныя фактары нельга аб'ектыўна зразумець без уздзеяння сацыяльна-палітычных і эканамічных фактараў. Нацызм – гэта эканамічная і палітычная праблема, але без уліку псіхалагічных фактараў немагчыма адказаць на пытанне, якім чынам гэты рух набыў такую моц і такую дынаміку, заняўшы за досыць кароткі тэрмін лідзіруючае месца ў нямецкім палітычным жыцці.

Неабходна адзначыць, што тэарэтычная канструкцыя таталітарызму не можа ў поўным аб'ёме прэтэндаваць на ўніверсальнае тлумачэнне ідэалогіі нацыянал-сацыялізму як масавага палітычнага руху таму, што параўнанне нацызму і бальшавізму мае хутчэй палітычны, чым навуковы характар.

Праварадыкальныя фашысцкія масавыя палітычныя рухі абапіраюцца на масавую таталітарную палітычную партыю (прыходзячы да ўлады, яна становіцца дзяржаўна-манапольнай арганізацыяй) і бясспрэчны аўтарытэт «правадыра», «фюрэра». У Італіі гэта была Нацыянальная фашысцкая партыя (Partito Nazionale Fascista) на чале з Мусаліні, а ў Германіі НСДАП (Nationalsozialistische Deutsche Arbeiterpartei) на чале з Гітлерам. Фашысцкія рэжымы і рухі фашысцкага тыпу шырока выкарыстоўваюць дэмагогію, папулізм, лозунгі сацыялізму, імперскай вялікадзяржаўнасці, апалагетыку вайны. Фашызм знаходзіць апору пераважна ў сацыяльна абяздоленых групах ва ўмовах агульнанацыянальных крызісаў і катаклізмаў мадэрнізацыі.

Сутнасць нацызму ўяўляе сабой уніфікацыю, радыкалізацыю і максімальна магчымую татальную ідэалагічную мабілізацыю палітычнага жыцця і масавай свядомасці немцаў. «Нацыфікацыя мас» (Gleichschaltung) уяўляе сабой механізм маніпуліравання палітычнымі паводзінамі мас з укараненнем у масавую свядомасць комплексу ідэалагічных міфаў нацызму. Нацызм, з пункта гледжання палітычных паводзін, – гэты таталітарны масавы рух, які ўвасабляе непрыманне і адмову ад бурных змен рамеснікамі, дробнымі гандлярамі, прадпрымальнікамі, сялянамі, службоўцамі, ветэранамі вайны.

Самаадрачэнне чалавека ад уласнага быцця, ператварэнне яго ў шэрую фанатычную масу – ядро гітлераўскага светапогляду, што ўяўляе сабой адмову кожнага немца ад усякага права на асабістае меркаванне, асабістыя інтарэсы, асабістае шчасце. Адлюстроўваючы сутнасць нацыянал-сацыялістычнага руху, М. Бросцат адзначае: «Знешняя форма і тэхніка кіраўніцтва нацыянал-сацыялістычнага руху ў значнай меры залежыла ад унутранага зместу, які вызначаўся светапоглядам, прапагандай і асобай правадыра. Аснову нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіі складалі нацыяналістычныя, агульнанямецкія, народна-антысеміцкія і антыліберальныя погляды, якія ў той або іншай сувязі знаходзілі адлюстраванне ў Германіі яшчэ да 1914 г., але толькі пасля вопыту Першай сусветнай вайны, паражэння Германіі і рэвалюцыі набылі вірулентны характар» [7, с. 32].

На наш погляд, НСДАП нельга разглядаць толькі як дробнабуржуазную партыю, як звычайна яе ўяўляюць савецкія даследчыкі. Нацыянал-сацыялізм ні ў якой меры не мог быць абмежаваны дробнабуржуазнай арыентацыяй. Неабходна падкрэсліць, што НСДАП ніколі не адмаўлялася ад намаганняў прыцягнуць да сабе ўсе пласты насельніцтва, у тым ліку працоўных, спачатку малазгодных з яе прапагандай.

Псіхалагічнай базай нацысцкага масавага палітычнага руху было тое, што Г. Кноп назваў «вялікім страхам»: «Гэта быў страх перад дэкласаваннем, беспрацоўем, бальшавізмам, страх перад усім новым, нязвыклым, непажаданым, страх, які прыйшоў да немцаў пасля крушэння 1918 г.» [8, с. 23]. Прывабнымі для мас сталі нацыяналістычныя і антысеміцкія пункты праграмы НСДАП, а таксама стыль яе палітыкі, які адказваў эмоцыям людзей усіх сацыяльных пластоў. Вялікую колькасць прыхільнікаў прыцягвала да НСДАП не яе праграма, а знешні выгляд гэтай партыі, атаясамлены з сілай, згуртаванасцю і спецыфічнай мужнасцю.

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



Сучасны нямецкі гісторык-ліберал Н. Фрай падкрэслівае: «Ужо ў Веймарскую эпоху дэманстрацыі, пастраенні са сцягам, факельныя шэсці, падчас якіх карычневая кашуля і свастыка служылі характэрнымі знешнімі апазнавальнымі знакамі, надзялялі "рух" непаўторнай індывідуальнасцю. Своеасабліваму знешняму выгляду адпавядала адмысловая свядомасць, якая адрознівала нацыянал-сацыялістаў ад звычайных партый (прычым не толькі ў іх уласных вачах): яны жадалі быць ідэйным і баявым саюзам, а не толькі палітычным аб'яднаннем па інтарэсах» [9, с. 87].

Першыя рэкруты ідэалогіі нацызму – розныя элементы, адметнай рысай якіх была сацыяльная неўладкаванасць: люмпены, франтавікі, палітычна і псіхічна няўстойлівыя прадстаўнікі сярэдніх класаў, злачынцы. Яшчэ падчас барацьбы за ўладу супраць членаў НСДАП было ўзбуджана 40 тыс. крымінальных спраў. У агульным, партыйцы былі асуджаны, па даных на канец 1932 г., на 14 тыс. гадоў турмы і на паўтара мільёна марак штрафу [10, с. 57].

Страшная праўда нацысцкага масавага руху складаецца з таго, што людзі станавіліся гарачымі прыхільнікамі фюрэра таму, што ён адкрыта выяўляў іх уласныя пачуцці. Гэтым вызначаецца галоўная адметная прыкмета таталітарнага масавага палітычнага руху – у ім узнікае з выгляду стыхійная, але на самой справе штучна накіраваная перадача інфармацыі, у выніку чаго асоба дзейнічае практычна без адчування асабістага кантролю над сітуацыяй. Так, напрыклад, акрэсліваючы прапагандысцкую ролю кнігі «Мая барацьба» і яе месца ў структуры гітлераўскага масавага руху, вядомы нямецкі гісторык В. Мазер адзначае: «Да негатыўных наступстваў, якія выклікала кніга "Майн Кампф" не ў апошнюю чаргу ставіцца і тое, што Гітлер і яго красамоўныя функцыянеры зрабілі рыторыку і палітычную прапаганду небяспечнымі сродкамі ў дзяржаве. У адпаведнасці з паданнямі і ідэямі, развітымі ў гэтай кнізе, прапаганда ўнесла істотны ўклад у "нанясенне шкоды свабодзе волі чалавека". З першай і да апошняй старонкі "Майн Кампф" даказвае, што ён (Гітлер. – заўвага *В.З.*, *А.С.*) мае на ўвазе не развіццё здольнасці да аб'ектыўнага аналізу і не індывідуальную волю, а прымус да аднастайнага палітычнага пераканання і рабскага паслухмянства» [11, с. 216].

Палітычная практыка нацызму рэалізавала абяцанні ідэалогіі: была створана іерархія, у якой кожны меў фюрэра, якому павінен быў падпарадкоўвацца, і падначаленага, над якім адчуваў сваю ўладу. Чалавек на самым версе – правадыр – меў над сабой Лёс, Гісторыю або Прыроду, гэта значыць нейкую вышэйшую сілу, у якой мог растварыцца.

Такім чынам, ідэалогія і практыка нацызму задавальняюць запыты, выходзячы з асаблівасцей псіхалогіі чалавека-масы, і задаюць арыентацыю абывацелям, кар'ерыстам і апартуністам: тым, каму не патрэбныя ні ўлада, ні падначаленне, але хто згубіў веру ў жыццё, уласныя рашэнні і наогул ва ўсё на свеце.

Сёння мы ведаем, што таталітарная дыктатура як форма палітычнай самаарганізацыі грамадства, якая абапіраецца на шырокі пласт масавага таталітарнага руху, прадэманстравала сваю няздольнасць да выжывання на працягу пэўнага гістарычнага перыяду. Кажучы аб недаўгавечнасці таталітарных рэжымаў, неабходна вылучыць галоўны фактар, які зыходзіць з самога масавага таталітарнага руху, – гэта немагчымасць доўгага звужэння да палітыкі непалітычных сфер чалавечага жыцця, што робіць немагчымай татальную палітызацыю больш чым на перыяд актыўнасці аднаго пакалення.

Масавы таталітарны палітычны рух у найбольшай ступені вызначаецца сутнасцю і асаблівасцямі палітычных паводзін чалавека ў масавым грамадстве. Ён адлюстроўвае «духоўную сітуацыю часу», якая характарызуецца некантралюемым прагрэсам тэхнікі, абясцэньваннем усіх каштоўнасцей, знікненнем глыбіні чалавечага быцця. У гэтай вельмі важнай сферы неабходна новае адкрыццё прыроды чалавека, здабыццё чалавекам самога сябе, усведамленне свайго месца і ролі ў жыцці грамадства. У адваротным выпадку чалавецтва чакаюць непрадказальныя наступствы не толькі ў сферы палітыкі, але і ў іншых.

*Літаратура*


1. *Канетти, Э.* Монстр власти / Э. Канетти, С. Московичи. – М.: Алгоритм, 2009. – 240 с.
2. *Ольшанский, Д.В.* Политическая психология / Д. В. Ольшанский. – СПб.: Питер, 2002. – 576 с.
3. *Гейден, К.* Путь НСДАП. Фюрер и его партия / К. Гейден – М.: Яуза, Эксмо, 2004. – 574 с.
4. *Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет. – М.: АСТ, 2003. – 509 с
5. *Райх, В.* Психология масс и фашизм / В. Райх; пер. с нем. Ю. Донца. – М.: АСТ, 2004. – 539 с.
6. *Моссе, Дж.* Нацизм и культура. Идеология и культура национал-социализма / Дж. Моссе; пер. с англ. Ю.Д. Чупрова. – М.: ЗАО «Центрполиграф», 2010. – 446 с.
7. *Бросцат, М.* Тысячелетний рейх / М. Бросцат; пер. с нем. В. Кузнецова. – М.: Эксмо, Яуза, 2004. – 352 с.
8. *Кнопп, Г.* Адольф Гитлер. Психологический портрет / Г. Кнопп; пер. с нем. Ж.А. Колобова. – М.: АСТ; Астрель, 2006. – 442 с.
9. *Фрай, Н.* Государство фюрера: Национал-социалисты у власти: Германия, 1933–1945 / Н. Фрай; пер. с нем. Л.Ю. Пантиной; науч. ред. А.Ю. Ватлин. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН); ГИИМ, 2009. – 255 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version